

# ТЭОРЫЯ, МЕТОДЫКА І АРГАНІЗАЦЫЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*А.І.СЦЕПАНЦОЎ*

## ПРАФЕСІЙНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ: ІНТЭГРАЦЫЯ МАСТАЦКА-ТВОРЧЫХ І НАВУКОВЫХ РЭСУРСАЎ

*Даследуюцца ўзаемасувязі адукацыйнага комплексу культуры ў адзінстве мастацка-творчых і навуковых сувязей, раскрываюцца перавагі і магчымасці кансалідацыі навукова-педагагічных творчых сіл адукацыйных устаноў сферы культуры Рэспублікі Беларусь ў мэтах удасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці.*

Сацыякультурны інстытут адукацыі мае першаступеннае значэнне для аптымальнага фарміравання сацыяльнай структуры ўсіх сфер грамадства, бо ў яго межах складваецца палітычная, эканамічная і культурная эліта. Дзякуючы пераемнасці ў мастацка-адукацыйным працэсе навучальныя ўстановы ў сферы культуры ажыццяўляюць яе захаванне і развіццё. Спецыялісты галіновых устаноў не толькі перадаюць веды і свой вопыт, выкладаючы той ці іншы прадмет мастацтва ці раскрываючы сакрэты інтэрпрэтацыі, многія з выкладчыкаў з'яўляюцца творцамі мастацкіх каштоўнасцей і сваёй творчасцю разам з творчасцю сваіх вучняў абумоўліваюць узровень мастацкай культуры, уплываюць на шырокую аўдыторыю слухачоў і гледачоў. Найбольш кваліфікаваная сацыяльная супольнасць – кадры навучальных устаноў. Яны вырашаюць важныя і адказныя задачы: забяспечваюць пераемнасць культурнага працэсу, выхоўваюць творчых асоб, здольных развіваць культуру.

Прафесійная адукацыя ў сферы культуры пададзена шырокім пералікам спецыялізацый мастацка-творчага, навукова-метадычнага, арганізацыйна-кіраўніцкага кірункаў дзейнасці. Такая дыферэнцыяцыя з'яўляецца праявай усеагульнай тэндэнцыі паглыблення і дэталёвага засваення прафесійных тэхналогій. Вузкая спецыялізацыя дае перавагі ў якасным набыцці і развіцці прафесійных навыкаў, але адначасова спараджае праблему цэласнага ўспрымання аб'екта дзейнасці, упісвання ў сістэму яго ўзаемасувязей і ўзаемазалежнасцей. Становіцца актуальнай неабходнасць прафесійных аб'яднанняў як унутрыгаліновых, так і міжгаліновых, міждзяржаўных.

У міжнароднай практыцы ёсць прыклады паспяховай дзейнасці такіх аб'яднанняў. Гэта Асацыяцыя сусветнай адукацыі – The Association for World Education (AWE) – міжнародная няўрадавая добраахвотная арганізацыя юрыдычных і фізічных асоб. Асноўная яе ідэя – "адукацыя адлюстроўвае ўсведамленне нашага цеснага ўзаемадзеяння з сусветам у цэлым, сёння шматлікія лакальныя супольнасці ва ўсім свеце падзяляюць агульны лёс, чалавецтва з'яўляецца геаэкалагічным цэлым адной і той жа біясферы", адукацыя з'яўляецца найбольш эфектыўным сродкам задавальнення патрэбнасцей чалавека і грамадства ў ведах. Сярод задач AWE – садзейнічанне ўзаемасувязі і ўзаемадзеянню фізічных і юрыдычных асоб, якія працуюць над разуменнем і распаўсюджваннем ідэй аб глабальных аспектах адукацыі; садзейнічанне абмену і перадачы ідэй, ведаў і вопыту сярод членаў AWE; аналіз, абагульненне і распаўсюджванне інавацый у адукацыі, што ўзмацняюць сувязь паміж глабальным і лакальным. Асацыяцыя мае кансультатыўны статус у ААН і аддзяленні ў 25 краінах свету, дзейнічае з 1970 г. [2]. Падобныя мэты маюць Сусветная асацыяцыя педагагічных навук – World Association for Education Research (WAER); Сусветная ліга адукацыі – Intrnacional

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

League for Child and Adult Education; Еўрапейская асацыяцыя міжнароднай адукацыі – European Association for International Education [5].

Два гады існуе Асацыяцыя навучальных установаў мастацтва і культуры Расійскай Федерацыі, якая выступае за перадавыя пазіцыі навучальных установаў культуры і мастацтва ў сістэме гуманітарнай адукацыі; за высокі статус ВНУ мастацтва і культуры; за разумнае рэфарміраванне ў мастацкай адукацыі па рэкамендацыях кампетэнтных спецыялістаў сферы культуры; за захаванне прынцыпаў бесперапыннай адукацыі ў сістэме “школа – вучылішча – ВНУ”; супраць нівеліравання адметных асаблівасцей навучальных установаў культуры. Асацыяцыя абвясціла падтрымку інавацыйным праектам, ініцыятывам, накіраваным на прагрэс, дапамогу таленавітай моладзі, навукова-даследчай, навукова-метадычнай рабоце, развіццю міжнародных сувязей; арганізацыі сімпозіумаў, канферэнцый, аглядаў, фестываляў, конкурсаў; выдавецкай дзейнасці [3]. Зразумела, што маштабы Расійскай Федэрацыі і тэрытарыяльна, і па колькасці ўстаноў робяць такое аб’яднанне больш віртуальным у параўнанні з нашай краінай – кампактнай і зручнай для асабістых творчых і навуковых зносін. Але прыклад арганізацыйнага аб’яднання заслугоўвае ўвагі, бо дае магчымасць канцэнтрацыі калектыўнай свядомасці, калектыўнай дзейнасці, выпрацоўкі агульных мэт.

У нашай краіне ўмоўны адлік пачатку працэсу фарміравання *адзінай сістэмы бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў галіне культуры* правамерна звязаць з прыняццем пастановы Саўміна БССР ад 5.08.1988 № 266, па якой з сістэмы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў падпарадкаванне Міністэрства культуры былі перададзены Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, Мінскі інстытут культуры, Мінскае мастацкае, Магілёўскае, Віцебскае, Гродзенскае, Мінскае культасветвучылішчы, Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. У гэты ж месяц Саўмін БССР прыняў пастанову “Аб генеральнай схеме кіравання Міністэрства культуры БССР”, у якой зацвярджаліся асноўныя кірункі дзейнасці, у адпаведнасці з пастановай у падпарадкаванне міністэрству перадаваліся установы былога Дзяржкіно, а сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, размешчаныя ў абласцях, – у кіраванне ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў [3]. Такім чынам, 3 вышэйшыя і 21 сярэдняя спецыяльная навучальная ўстановы склалі адзіную прафесійную сістэму падрыхтоўкі кадраў культуры. Былі закладзены адзіныя арганізацыйна-метадычныя асновы для ўдасканалення ўсіх адукацыйных узроўняў сістэмы прафесійных навучальных установаў культуры, паглыблення іх творчых сувязей.

Пасля набыцця краінай палітычнай і эканамічнай незалежнасці ўзмацняліся і далей развіваліся агульнадзяржаўныя падыходы да кадравага будаўніцтва, усталёўвалася кадравая сістэма галіны культуры як сукупнасці ўзаемазвязаных падсістэм: прафесійнай дзейнасці непасрэдных стваральнікаў культурнага прадукту і арганізатараў культурнай вытворчасці; бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў галіне культуры (падрыхтоўка і ўдасканаленне кадраў культуры). Дзяржаўная палітыка ў галіне культуры скіроўваецца на стварэнне матэрыяльных умоў для рэалізацыі працэсаў узнаўлення і развіцця культуры, умоў для культурных зносін, асэнсавання эстэтычных каштоўнасцей.

Аснову сістэмы прафесійнай адукацыі ў сферы культуры складаюць спецыялізаваныя ўстановы, якія рыхтуюць кадры для ўсіх відаў прафесійнай творчай дзейнасці ў сферы культуры, забеспячэння яе функцыянавання. Сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы культуры задавальняюць патрэбнасці рэгіёнаў у спецыялістах сярэдняй кваліфікацыі. Яны з’яўляюцца важным этапам прафесійнага фарміравання спецыяліста культуры, бо менавіта тут закладваюцца асноўныя перадумовы сталення і загартоўкі ў абранай спецыяльнасці, замацавання ў сферы культуры. Развіццё і паглыбленне сістэмы навучання, своеасаблівая агранка здольнасцей, уменняў і навыкаў адбываюцца ў вышэйшых навучальных установах, што забяспечваюць спецыялістамі мастацкай творчасці арганізацыі вольнага часу, найбольш значныя творчыя пасады ўстаноў культуры, а таксама рыхтуюць выкладчыцкія кадры. ВНУ культуры – буйныя культурна-асветныя цэнтры краіны, шырока ажыццяўляюць канцэртную, выставачную, тэатральную дзейнасць, якая набыла вядомасць за межамі краіны, ажыццяўляюць падрыхтоўку навуковых і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі для сферы культуры праз аспірантуру і дактарантуру. Падтрымку неабходнага ўзроўню прафесійнай кваліфікацыі спецыялістаў на працягу ўсёй працоўнай дзейнасці ў адпаведнасці з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

запатрабаваннямі часу ВНУ культуры і мастацтваў забяспечваюць праз структуры паслядыпломнай адукацыі. Яны садзейнічаюць прафесійнаму ўдасканаленню і самаразвіццю асобы, спрыяюць павышэнню кампетэнтнасці, прырашчэнню прафесійных якасцей, пашырэнню прафесійнага далягляду, засваенню новых тэхналогій.

Прафесійная адукацыя ў сферы культуры забяспечвае падрыхтоўку “профільнага ўзнаўляльніка-інтэрпрэтатара актуальных культурных формаў і творцы – распрацоўшчыка новых формаў”. Будучыя спецыялісты засвойваюць фундаментальныя і прыкладныя веды і ўменні па прадмеце, функцыях і тэхналогіях будучай дзейнасці, а таксама прынцыпы адпаведнай прафесійнай культуры.

Пасля заканчэння спецыялізаваных навучальных устаноў маладыя спецыялісты атрымоўваюць навыкі прадуктыўнай дзейнасці (і ў тым ліку творчай, інавацыйнай) у абранай сферы, засвойваюць сістэму “культурнай кампетэнтнасці” на новым, больш высокім узроўні. Выпускнікі прафесійных навучальных устаноў галіны падрыхтаваны да выканання задач, якія вызначаны Канцэпцыяй прафесійнай адукацыі ў галіне мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь: “... стварэнне, захаванне і развіццё нацыянальных мастацкіх школ як стрыжнёвага фактару і падмурка беларускай мастацкай культуры; навучанне і выхаванне творчых кадраў у галіне музычнага, выяўленчага і тэатральнага мастацтва на ўсіх узроўнях прафесійнай падрыхтоўкі; ажыццяўленне творчай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне мастацтва” [4, с. 7].

Пры даследаванні ўзаемасувязей адукацыйнага комплексу культуры як адзінага аб’екта звяртае на сябе ўвагу наяўнасць паралельных вучэбных кірункаў у ВНУ. Мастацтва музычнае і харэаграфічнае прадстаўлены ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі; мастацтва тэатральнае і дэкаратыўна-прыкладное – у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Тэорыя і гісторыя культуры, мастацтвазнаўства – ва ўсіх трох ВНУ культуры.

Спецыяльнасці культуры прадстаўлены таксама ў шэрагу класічных універсітэтаў нашай краіны і інстытутаў. Нагадаем, што ўсе тры ВНУ культуры належаць да тыпу профільнага універсітэта (акадэміі) па вызначэнні закона Рэспублікі Беларусь “Аб вышэйшай адукацыі” [7].

Беларускі дзяржаўны універсітэт і Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльна-тэхнічных навук прапануюць спецыяльнасць “дызайн”. У Віцебскім дзяржаўным універсітэце асвойваюць спецыяльнасці “дызайн”, “выяўленчае мастацтва”, “дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”, “музычнае мастацтва”, “бібліятэказнаўства і бібліяграфія”. У Інстытуце сучасных ведаў – спецыяльнасці “прадзюсерства ў сферы мастацтва”, “дызайн”, “мастацтва эстрады (інструментальная музыка, спевы, камп’ютэрная музыка)”. У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце авалодваюць спецыяльнасцямі “музычнае мастацтва”, “дызайн”, “выяўленчае мастацтва”, “народная творчасць” (народны танец), у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце – спецыяльнасцямі “музычнае мастацтва”, “тэатральнае мастацтва”, а ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце – спецыяльнасцямі “музычнае мастацтва”, “харэаграфічнае мастацтва” (народны танец) [1].

Такім чынам, творчыя і навуковыя сілы, якія належаць да сферы культуры, прадстаўлены ў 10 установах вышэйшай адукацыі і адпавядаюць патрэбнасцям краіны ў кадрах вышэйшай кваліфікацыі культурастваральнага кірунку.

Грамадскай практыкай назапашаны пэўны вопыт узаемадзеяння творчых, навуковых сіл, якія складаюць ядро, аснову сістэмы прафесійнай адукацыі. Ажыццяўляючы прафесійную дзейнасць у складзе спецыялізаваных кафедраў кожнай з ВНУ, навукова-педагагічная супольнасць сферы культуры аб’ядноўвае свае творчыя сілы ў цэлым шэрагу сумесных мерапрыемстваў. Гэта навуковыя, вучэбна-метадычныя канферэнцыі, семінары, фестывалі, агляды-конкурсы, выставы прафесійнага і аматарскага мастацтва. Створаны і грамадскія творчыя аб’яднанні, асацыяцыі па асобных жанрах мастацкай творчасці ў складзе Саюза музычных дзеячаў. Плённа працуе Вучэбна-метадычнае аб’яднанне (ВМА) вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў, якое каардынуе вучэбна-метадычную дзейнасць педагагічнай грамадскасці вышэйшых навучальных устаноў і спецыялістаў-практыкаў у рашэнні задач па распрацоўцы дзяржаўных адукацыйных стандартаў; удасканаленні арганізацыйнага,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кадравага і метадычнага забеспячэння вучэбнага працэсу; забеспячэнні інтэграцыі вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь у сусветным адукацыйным супольніцтве.

Аднак непасрэдная выкладчыцкая дзейнасць па той ці іншай спецыялізацыі праходзіць выключна ў рамках сваёй ВНУ, і такое адасабленне прыводзіць да нетрывалых сувязей паміж кафедрамі роднасных спецыяльнасцей і спецыялізацый іншых ВНУ, не кансалідуе творчыя сілы выкладчыкаў, прыводзіць да дубліравання кірункаў адукацыі, зніжае эфектыўнасць арганізацыйна-кіраўніцкіх сувязей, стрымлівае магчымасці распаўсюджвання лепшага вопыту як выкладання, так і актывізацыі самастойных заняткаў студэнтаў.

Шырокая сетка сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў культуры ахоплівае ўсю рэспубліку і забяспечвае кадрамі сярэдняй кваліфікацыі ўстановы культуры і адукацыі, а таксама служыць крыніцай папаўнення студэнцкага кантынгенту вышэйшых навучальных устаноў не толькі культуры, але і адукацыі.

У шэрагу ССНУ сістэмы адукацыі таксама рыхтуюцца спецыялісты роднасных прафесій. Беларускі рэспубліканскі вучэбны комплекс гімназія-каледж мастацтваў імя І.В.Ахрэмчыка рыхтуе кадры па спецыяльнасцях “жывапіс”, “скульптура”, “дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”, “фартэпіяна”, “струнныя народныя і смычковыя інструменты”, “дырыжыраванне”, “духавыя і ўдарныя інструменты”. Мінская дзяржаўная гімназія-каледж мастацтваў рыхтуе будучых прафесіяналаў па спецыяльнасцях “дызайн”, “дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”. Магілёўскі рэспубліканскі вучэбны комплекс гімназія-каледж мастацтваў рыхтуе кадры па спецыяльнасцях “фартэпіяна”, “дырыжыраванне”, “струнныя смычковыя інструменты”, “духавыя і ўдарныя інструменты”, “баян-акардэон”, “харэаграфічнае мастацтва”. Вучэбны комплекс школа-каледж мастацтваў г. Бабруйска рыхтуе спецыялістаў па харэаграфічным мастацтве. Такім чынам, назіраецца разрозненасць творчых сіл па двух ведамствах і ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі.

Праблемнымі ўяўляюцца інтэграцыйныя сувязі ВНУ – ССНУ. Найбольш адпрацаваныя яны ў сістэме музычнай адукацыі. Беларуская акадэмія музыкі мае свае філіялы на базе абласных навучальных устаноў у Брэсце, Гродне, Віцебску, Гомелі, а таксама ў Маладзечне. Такая мадэль ужо прадэманстравала сваю эфектыўнасць і па якасці навучання, і па магчымасцях задавальнення патрэбнасцей рэгіёнаў у спецыялістах.

Уяўляецца мэтазгодным усталяванне такіх сувязей Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў з Гродзенскім і Мінскім дзяржаўнымі каледжамі мастацтваў, Магілёўскім дзяржаўным вучылішчам культуры, Пінскім дзяржаўным вучылішчам мастацтваў. Адбор студэнтаў і рэкамендацыі для працягу навучання ў ВНУ мэтазгодна праводзіць па выніках навучання пасля двух курсаў, з трэцяга курса – будаваць навучанне па інтэграванай сістэме з улікам магчымага залічэння на другі курс ВНУ.

Усе спецыяльнасці ў сферы культуры лагічна групуюцца па інтэлектуальных і дзейнасных кірунках: культурастваральная дзейнасць (падрыхтоўка творцаў і інтэрпрэтатараў каштоўнасцей культуры – мастакоў, скульптараў, рэжысёраў, акцёраў, музыкантаў, балетмайстраў, танцоўшчыкаў, іншых практыкаў, педагогаў і крытыкаў у сферы прафесійнай культуры); навуковае асэнсаванне заканамернасцей культурнага працэсу (падрыхтоўка навукоўцаў і выкладчыкаў у галіне філасофіі, тэорыі, сацыялогіі і псіхалогіі культуры, экспертаў па сацыякультурных праблемах і міжкультурным узаемадзеянні, гісторыкаў і тэарэтыкаў па ўсіх відах прафесійнага і народнага мастацтва); прыкладная культурна-арганізацыйная дзейнасць (падрыхтоўка кіраўнікоў устаноў культуры, арганізатараў культурна-масавых мерапрыемстваў і аматарскай дзейнасці, менеджэраў сферы культуры, прадзюсераў, спецыялістаў культурных камунікацый, тэхнолагаў сацыякультурнай дзейнасці).

Менавіта гэтыя кірункі даюць падставу для аб’яднання ў асацыяцыю навучальных устаноў у сферы культуры з захаваннем права юрыдычнай асобы, замацаваннем аптымальных суадносін цэнтралізацыі спецыялізаваных прафесійных кірункаў і эфектыўнага злучэння з асаблівасцямі творчасці кожнай катэгорыі супрацоўнікаў, студэнтаў.

На наш погляд, стварэнне такой асацыяцыі ў сферы культуры будзе спрыяць забеспячэнню спецыялістамі культуры ўсіх зацікаўленых галін Рэспублікі Беларусь,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падтрымае імкненне да ўдасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці вышэйшай кваліфікацыі, аб'яднае мастацка-творчыя, навуковыя, вучэбна-метадычныя рэсурсы прафесійнай адукацыі. Самае галоўнае, улічваючы існаванне і паспяховае функцыянаванне падобных асацыяцый у суседніх краінах, з'явіцца магчымасць змястоўнага і сістэматычнага абмену вопытам педагагічнай работы, навукова-тэарэтычнага абагульнення сацыякультурнай дзейнасці ў нашай краіне, акрамя таго, атрымае трывалы арганізацыйны падмурак бесперапынная адукацыя ў сістэме "школа – вучылішча – ВНУ".

---

1. *Абитуриент-2008.* Высшие учебные заведения Республики Беларусь: справочник / сост. П.И.Новодворский. – Мн.: Вышэйш. шк., 2008. – 511 с.

2. *Ассоциация* Всемирного образования = The Association for World Education (AWE) [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.iheu.org/node/2374. – Date of access: 18.04.09.

3. *Ассоциация* учебных заведений искусства и культуры / http: // www.intforus.ru.

4. *Канцэпцыя* прафесійнай адукацыі ў галіне мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь / рэд.-склад. В.Яканюк. – Мн.: БДА музыкі, 1999. – 70 с.

5. *Международные* ассоциации / http: // www. trajectory. org. ua / guide / associations. html.

6. *Национальный* архив Республики Беларусь. – Фонд № 7. – Оп. № 10. – Д. № 1108.

7. *Об образовании:* закон Республики Беларусь // Высшее образование Республики Беларусь: нормативно-правовое регулирование: сб. норм.-прав. актов / сост.: И.В.Титович [и др.]. – Мн.: РИВШ, 2006. – 222 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ